# ТАЦЦЯНА ЯНУШОНАК: «ГАЛОЎНАЕ – НЕ БАЯЦЦА СПРАБАВАЦЬ»

**Бываюць сустрэчы, што вяртаюць нас да вытокаў, да тых людзей, якія калісьці сталі для нас праваднікамі ў свет ведаў і маральных каштоўнасцей. Мая суразмоўніца – Таццяна ЯНУШОНАК, выпускніца факультэта беларускай філалогіі і культуры ВДУ імя П.М. Машэрава 2010 года. Яе прафесійны і жыццёвы шлях можа служыць прыкладам таго, як шчырая любоў да сваёй справы і роднай мовы адкрывае любыя дзверы і дапамагае рэалізавацца ў прафесіі на малой радзіме.**

Сёння Таццяна Фёдараўна – галоўны спецыяліст аддзела па адукацыі Міёрскага райвыканкама. Але многія ведаюць яе як патрабавальную і таленавітую настаўніцу беларускай мовы і літаратуры, чулага класнага кіраўніка (і мне пашчасціла быць сярод яе вучняў) і творчую асобу.

Я пагаварыла з ёй, як змянілася сучасная школа, ці лёгка быць метадыстам з душой настаўніка і дзе шукаць натхненне філолагу ў віхуры штодзённых спраў.

**– Таццяна Фёдараўна, давайце вернемся ў мінулае. Чаму менавіта Віцебск і беларуская філалогія?**

– Мае гады дзяцінства, маленства і юнацтва прайшлі на маляўнічых прасторах аграгарадка Туркова, што на Міёршчыне. Бацькі і іх бацькі (бабулі і дзядулі) пражывалі побач з гэтай мясцовасцю, мяне цікавілі школьныя падручнікі іх часу навучання, якія былі ў доступе на паліцы, гарышчы. Гаспадарчыя пабудовы служылі дошкай, некаторыя захоўваюць запіс тых гадоў і сёння. На «заняткі» наведваліся суседскія хлопцы. Таму да «ўрокаў» я рыхтавалася, пісала планы-канспекты, прарэшвала заданні. Мела ў арсенале і сапраўдны журнал. У школе ж мае настаўнікі заўсёды тлумачылі матэрыял, прыводзячы прыклады са свайго асабістага жыццёвага вопыту, а гэта запамінаецца назаўжды. Улічваючы свае жаданні і імкненні, акунулася ў прафесію мары.

**– Калі б вам трэба было апісаць атмасферу вашага факультэта таго часу некалькімі словамі, што б вы сказалі?**

– Атмасфера ўзаемадапамогі, яркі і незабыўны час студэнцтва. За 5 гадоў пражывання ў інтэрнаце атрыманы ўнікальны вопыт, які загартаваў характар, развіў фінансавую і бытавую самастойнасць, навучыў зносінам і кампрамісам ва ўмовах цеснага суседства. Сумеснае прыгатаванне ежы, уборка, арганізацыя вольнага часу навучылі працаваць у камандзе, зблізілі трох Таццян з Полацка, Докшыц і Міёраў. Несумненна, у гэтай дружбы магутны падмурак.

**– Філолагі заўсёды шмат чытаюць. Ці была ў вас любімая кніга або аўтар, якіх вы адкрылі для сябе менавіта падчас вучобы?**

– Творчасць Васіля Быкава. Тэма любові да Радзімы, трывога за яе будучыню, увага да кожнага чалавека, актыўная жыццёвая пазіцыя праходзяць праз усю яго творчасць. Гэта мне адклікаецца.

**– У кожнага пакалення студэнтаў ёсць свае «легендарныя» выкладчыкі. Хто для вас стаў сапраўдным праваднiком у свет мовы і літаратуры?**

– З удзячнасцю згадваю Віктара Уладзіміравіча Таранеўскага, глыбокага і дасведчанага выкладчыка. Першая лекцыя ў 2005 годзе была яго. Запомнілася незвычайнае прывітанне-зварот першакурснікам: «Калі вы адчулі, што знаходзіцеся невядома дзе, невядома для чаго, значыць, патрапілі сюды правільна». Потым першая практыка пад кіраўніцтвам Віктара Уладзіміравіча. Ды як можа не запомніцца чалавек, які падобны да Скарыны-першадрукара?!

**– Калі б вы маглі адправіць паштоўку самой сабе – студэнтцы першага курса, што б вы там напісалі?**

– Падзякавала б за настойлівасць, цягу да ведаў, за тое, што не здрадзіла сваім думкам і памкненням, рэалізавала мару дзяцінства.

**– Пасля атрымання дыплома вы прыехалі ў Навапагосцкую сярэднюю школу імя Г.І. Цітовіча выкладаць родную мову. Як вас там сустрэлі?**

– Добра. Складанасцей не ўзнікала, адміністрацыя абазначыла адразу кола дзейнасці. Удалося лёгка знайсці паразуменне ў калектыве, атрымаць падтрымку, завесці сяброўства.

**– Я вас памятаю як цудоўнага класнага кіраўніка. А якім вы бачылі наш клас? Што для вас значыла гэтая роля – «класная мама»?**

– Безумоўна, класнае кіраўніцтва – адказная роля. Гэта не проста правесці пазакласнае мерапрыемства, згуртаваць вучнёўскі калектыў, быць прыкладам добранадзейнасці. Трэба быць дарадцам, матываваць, верыць у патэнцыял і поспех кожнага, запаліць ідэяй, паказваць магчымасці самаўдасканалення, быць справядлівым. Ты можаш падрыхтавацца да ўрокаў, але не да нейкіх пазаштатных сітуацый і раптоўных пытанняў. З самага першага дня знаёмства з вашым класам убачыла дапытлівых і рашучых вучняў.

**– Сёння вы займаеце адказную пасаду. Ці адрозніваюцца погляды настаўніка і метадыста?**

– Думаю, што не. І на адной, і на другой пасадзе ты шчыруеш на карысць вучня і дзяржавы. Галоўны спецыяліст аддзела па адукацыі не можа быць безыніцыятыўным. Гэтая пасада пра арыентацыю на вынік, уменне ставіць мэты і дасягаць іх, захоўваць прадуктыўнасць у складаных сітуацыях.

**– Якім вы бачыце настаўніка будучыні?**

– Нядаўна прачытала, што настаўнік будучыні – не проста носьбіт ведаў, але і правадыр каштоўнасцей, культурнага дыялогу і гуманістычных ідэалаў. Мне таксама блізкая гэтая думка.

**– Якія каштоўнасці вы лічыце самымі важнымі для выхавання маладога пакалення беларусаў?**

– Сумленнасць, чэснасць, добразычлівасць, актыўная жыццёвая пазіцыя, вытрымка. Маладому пакаленню важна паглыбляцца ў гісторыю нашай краіны, цаніць закладзены падмурак, быць адданымі Бацькаўшчыне. Толькі тады ўсё атрымаецца.

**– Калі вы пачалі захапляцца фатаграфіяй?**

– Калі нарадзілася дачушка. Тады мне захацелася засняць і захаваць усе цікавыя і значныя моманты, звязаныя з ёй. Пазней прайшла некалькі анлайн-курсаў, фотамарафоны.



**– Што часцей трапляе ў ваш аб'ектыў? Чым фотамастацтва дапамагае вам у жыцці?**

– Яно ўпрыгожвае знутры. Здымаць, як і пісаць вершы, даводзіцца не кожны дзень, а па натхненні. Гэты працэс дапамагае пераключыцца, часам знайсці рашэнне праблемнага пытання. У маім аб'ектыве часцей прырода, з якой я адчуваю асаблівую еднасць.

**– Кажуць, што амаль кожны студэнт-філолаг спрабуе пісаць літаратурныя творы, але далёка не кожны працягвае гэта рабіць усё жыццё. З чаго пачалася ваша творчая дзейнасць?**

– Мая паэтычная гісторыя пачалася ў школе, калі мне прапанавалі напісаць верш для ўдзелу ў творчым конкурсе. Гэта быў дзесьці шосты клас.

**– Што для вас з'яўляецца галоўным штуршком для напісання верша?**

– Надвор'е. Асабліва калі ідзе дождж ці снег.

**– У вас ёсць дэвіз, якім вы карыстаецеся ў жыцці?**

– Натхняюся цытатай Макса Фрай: «Не бойся, што не атрымаецца, бойся, што не паспрабуеш». І яно сапраўды так. Страх бяздзейнасці і страчаных магчымасцей значна горш, чым сам магчымы правал. Бо толькі паспрабаваўшы, можна дасягнуць чагосьці або даведацца нешта новае. Спроба, нават няўдалая, дае вопыт, веданне і магчымасць для росту. Без спробы няма выніку і навучання.

**– Дзякуй за такую добрую і душэўную размову!**

**Марыя ПУДАВА,**
**студэнтка 2 курса ФГВіК.**